**АДКАЗВАЕМ НА 8 ПЫТАННЯЎ ПРА ЗНІЖКІ НА НАВУЧАННЕ**
Каментуе начальнік Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці Алена ДАСТАНКА
Стар. 2

**ФАКУЛЬТЭТУ ЖУРНАЛІСТЫКІ 75 ГАДОЎ!**
Дэканы і студэнты расказалі пра месца, дзе юнацтва распраўляе крылы
Стар. 4–5

**АЎТАРСКІЯ ПРОФІЛІ ДЛЯ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**
Разбіраем са спецыялістамі, як навукоўцу папулярызаваць свае публікацыі
Стар. 6

**«ВУЧЫЦЦА НА ДЗЯСЯТКІ РЭАЛЬНА!»**
Так сцвярджае магістрант з Туркменістана Раўшэн АТАЕЎ
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

25 лістапада 2019 года, № 14 (2220)




Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

АКТУАЛЬНА

# Выбарчае права: ад вытокаў у будучыню

Фота і відэа gazeta.bsu.by

**У БДУ адбылася выстава, прысвечаная галоўнай палітычнай падзеі года – выбарам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання, якія прайшлі 17 лістапада. У бібліятэчнай зале юрыдычнага факультэта дэманстравалася больш за 200 унікальных экспанатаў, прадстаўленых музеем гісторыі БДУ і Фундаментальнай бібліятэкай.**




Выстава распавяла пра супрацоўнікаў універсітэта, якія працавалі ў вышэйшых органах улады ў розныя эпохі Савецкага Саюза і на сучасным этапе. Акрамя таго, наведнікі выставы пазнаёміліся з гісторыяй барацьбы жанчын у Расіі і Беларусі за атрыманне права голасу на выбарах у 1910–1920-я гг. Ініцыятарам правядзення выставы сталі Саюз жанчын БДУ і пярвічная арганізацыя БДУ РГА «Белая Русь».

## Асоба лепшая за падручнікі

Выставу «Выбарчае права: ад вытокаў у будучыню» адкрыў рэктар БДУ **Андрэй КАРОЛЬ.** Ён высока ацаніў яе адукацыйны патэнцыял:

– Вельмі важна далучаць маладых людзей да грамадска-палітычнага жыцця краіны, бо ўжо праз 10–20 гадоў мы ўбачым цяперашніх студэнтаў сярод прадстаўнікоў органаў улады. На мой погляд, выстава ілюструе канцэпцыю Універсітэта 3.0: тут ёсць і навуковая аснова, і практыка-арыентаванасць, і асобасныя моманты, якія заўсёды прыцягваюць, і часам лепш за важкія падручнікі даюць уяўленне пра наша мінулае і сучаснасць. Гэта дазваляе стварыць перспектывы: што было раней і што ёсць цяпер. Прасачыць генезіс выбараў не толькі ў агульнадзяржаўным рэчышчы, але і ў гендарным аспекце: якая роля жанчыны ў гэтым працэсе. Такая шматмернасць карысная з навуковага і пазнавальнага пунктаў гледжання.

**Заканчэнне на 3-й стар.**

УНІВЕРСІТЭТ
25 лістапада 2019 года, № 14 (2220)

# Адказваем на 8 важных пытанняў пра зніжкі на навучанне

У 2019/2020 навуч. годзе ў БДУ 411 студэнтаў атрымалі зніжку на аплату навучання. Сярод іх 1 студэнт завочнай формы навучання і 5 замежных грамадзян. На пытанні пра тое, як атрымаць такое паніжэнне аплаты, нам дапамагла адказаць **Алена ДАСТАНКА,** начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці.



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

## 1 Як можна атрымаць зніжку?

Зніжкі даюцца студэнтам на наступных умовах:

1. тым, хто дасягнуў высокіх паказчыкаў у навучальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы;
2. тым, хто адносіцца да катэгорый грамадзян, што маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы, а менавіта студэнты:
   • якія з'яўляюцца членамі малазабяспечаных сем'яў;
   • якія з'яўляюцца дзецьмі-сіротамі, дзецьмі, пакінутымі без апекі бацькоў, а таксама асобы ва ўзросце 18–23 гадоў, якія страцілі апошняга з бацькоў у перыяд навучання;
   • з ліку дзяцей асобаў, пералічаных у законе «Пра дзяржаўныя сацыяльныя льготы, правы і гарантыі для асобных катэгорый грамадзян»;
   • інваліды I, II і III групы, дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў;
   • якія маюць ільготы або з ліку асобаў ва ўзросце да 23 гадоў, што не маюць уласнай сям'і, бацькі якіх маюць ільготы, у адпаведнасці з законам «Пра сацыяльную абарону грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый»;
   • з сем'яў, у якіх выхоўваецца трое і больш непаўналетніх дзяцей;
3. пераможцам і прызёрам Алімпійскіх, Паралімпійскіх, Дэфлімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, сусветных універсіяд.

## 2 Як добра трэба вучыцца, каб атрымаць зніжку?

Паводле заканадаўства і нарматыўных дакументаў ВНУ, зніжэнне аплаты за навучанне падаецца студэнтам, якія ў папярэднім навучальным годзе паказалі высокія вынікі пры здачы сесій. *У залікоўцы па выніках навучальнага года павінна быць не меней за 50 % адзнак – 9 і 10 балаў, а астатнія адзнакі – не ніжэйшыя за 6 балаў.* Акрамя таго, прэтэндэнты на зніжэнне аплаты навучання павінны мець добрыя вынікі ў даследчай дзейнасці грамадскай працы ВНУ.

Зніжкі студэнтам, якія адносяцца да катэгорый грамадзян, што маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы, а таксама студэнтам, якія з'яўляюцца прызёрамі чэмпіянатаў свету і Еўропы, падаюцца пры ўмове атрымання па ўсіх прадметах адзнак не ніжэйшых за 6 балаў, уключаючы адзнакі па выніках здачы іспытаў, дыферэнцыяваных залікаў, курсавых прац і праектаў, усіх практык.

## 3 Наколькі можа паменшыцца аплата?

Памер зніжак студэнтам, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у навучальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы, залежыць ад сярэдняга бала паспяховасці па выніках за навучальны год і не можа перавышаць 60 %. *Калі сярэдні бал складае ад 7,46 да 8,25 бала, то памер зніжкі будзе складаць 20 % ад сфарміраванага кошту навучання, ад 8,25 да 9 – 40 %, звыш 9 – 60 %.*

Зніжкі студэнтам, якія адносяцца да катэгорый грамадзян, што маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы, падаюцца ў памеры 40 %.

Зніжкі студэнтам, якія з'яўляюцца пераможцамі і прызёрамі Алімпійскіх, Паралімпійскіх, Дэфлімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, сусветных універсіяд, падаюцца ў памеры 60 %.

## 4 Як ацэньваецца памер зніжкі, калі гаворка ідзе не пра паспяховасць?

Памер зніжкі ацэньваецца пры *адначасовай* наяўнасці высокіх паказчыкаў у навучальнай, навукова-даследчай і грамадскай працы. Пад высокімі паказчыкамі навукова-даследчай дзейнасці разумеецца сістэмная праца на працягу навучальнага года, якая рэалізуецца ў наступных формах:

• напісанне курсавых прац, якія змяшчаюць элементы навуковых даследаванняў;
• праца ў студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях і гуртках;
• правядзенне самастойных даследаванняў з прадстаўленнем навуковых вынікаў на міжнародны, рэспубліканскі конкурсы навуковых прац студэнтаў, конкурс БДУ;
• наяўнасць навуковых матэрыялаў, апублікаваных або прынятых да публікацыі ў зборніку тэзісаў дакладаў, у навуковых і навукова-практычных выданнях;
• удзел у навуковых канферэнцыях, прафесійных раённых, гарадскіх, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсах;
• выкананне дзяржбюджэтных ці гасдамоўных тэм НДЛ кафедраў і НДЛ факультэта на ўмовах аплаты;
• выкананне канкрэтных нетыпавых заданняў навукова-даследчага характару ў перыяд вытворчай ці навучальнай практыкі;
• выкананне навуковых праграм і праектаў;
• удзел у выставах і алімпіядах.

Пад высокімі паказчыкамі ў грамадскай працы разумеецца сістэмная праца на працягу навучальнага года, якая рэалізуецца ў наступных формах:

• праца ў органах самакіравання і маладзёжных аб'яднаннях БДУ;
• удзел у складзе творчых калектываў і іншых клубных фарміраванняў упраўлення па справах культуры БДУ, ва ўніверсітэцкіх фэстах, конкурсах і выставах мастацкай творчасці;
• удзел у складзе зборных каманд факультэта ў спартакіядзе БДУ;
• удзел у складзе зборных каманд БДУ па відах спорту ў раённых, гарадскіх спаборніцтвах, у чэмпіянатах, кубках свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь, Сусветнай універсіядзе, Рэспубліканскай універсіядзе;
• членства студэнта-спартсмена ў складзе нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па відах спорту;
• удзел у тэатралізаваным шэсці, прысвечаным святкаванню Дня Незалежнасці;
• удзел на пастаяннай аснове ў добраахвотніцкім руху; прафарыентацыйнай працы; працы студэнцкай куратарскай службы; рэдкалегіях газет; працы прыёмнай камісіі і пры правядзенні ЦТ; працы ў якасці мадэратара і адміністратараў сайтаў факультэтаў і афіцыйных груп у сацыяльных сетках.

## 5 Калі студэнт разумее, што ў яго ёсць права на зніжку, куды звяртацца?

Калі вы прэтэндуеце на зніжку са сфарміраванага кошту навучання, то неабходна звярнуцца ў дэканат факультэта. Рашэнне пра падаванне зніжкі прымае камісія, у склад якой уваходзяць прарэктары, дэканы ці іх намеснікі, прадстаўнікі прафсаюзных, моладзевых грамадскіх аб'яднанняў, органаў самакіравання БДУ. Камісію ўзначальвае рэктар універсітэта.

## 6 А першакурснік можа атрымаць зніжку ўжо ў першы год навучання?

Зніжкі падаюцца з другога курса. Але ў першакурснікаў ёсць цэлы год, каб выявіць сябе і атрымаць зніжку ўжо ў наступным навучальным годзе.

## 7 На які тэрмін падаецца зніжка?

З 1 верасня, і дзейнічае да заканчэння навучальнага года.

## 8 Ці могуць забраць зніжку?

Зніжкі адмяняюцца ў такіх выпадках: атрыманне нездавальняльных адзнак па выніках экзаменацыйнай сесіі, парушэнне правіл унутранага распарадку і грамадскага парадку.

## Водгукі студэнтаў

**Дзмітрый БЯЛЬКО, студэнт 4 курса факультэта міжнародных адносін. У 2019/2020 навучальным годзе дадзена зніжка 60 %:**



– Я атрымаў зніжку дзякуючы высокім паказчыкам у навучальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы. Мой сярэдні бал за мінулы год – 9,8. Апроч гэтага, я рэгулярна браў удзел у навуковых мерапрыемствах ФМА, БДУ і нават за мяжой. З'яўляюся членам СНДЛ «Знешняя палітыка і дыпламатыя ў сучасных міжнародных адносінах: прыклады аналіз». Не забываю і пра публікацыі.

Змог выявіць сябе ў грамадскай працы. Я староста сваёй акадэмічнай групы. Таксама ўдзельнічаю ў арганізацыі розных сустрэч, якія праходзяць на факультэце і ва ўніверсітэце. Што тычыцца студэнцкіх арганізацый, магу сказаць, што за час вучобы паспеў пабываць у актыве некаторых з іх, аднак пасапраўднаму я знайшоў сябе ў праектнай сферы. На дадзены момант займаю пасаду кіраўніка арганізацыйнага камітэта праекта «Мадэляванне ААН на ФМА БДУ». Адзначу, што ў снежні мінулага года ён быў прызнаны найлепшым моладзевым праектам БДУ, і ўжо з'яўляецца адной з візітовак нашага факультэта і ўніверсітэта.

Скажу шчыра, што за ўсім гэтым стаіць вялікая праца. Насамрэч, такі хуткі рытм жыцця патрабуе сабранасці і ўмення не толькі планаваць падзеі, але і прытрымлівацца вызначанага плана. І я хацеў бы падзякаваць факультэту і ўніверсітэту за стварэнне максімальна камфортных умоў для рэалізацыі свайго патэнцыялу.

Памятаю, як хваляваўся, што не паспею падацца на зніжку, таму што мой навуковы артыкул выходзіў не раней за сярэдзіну жніўня. У дэканаце супакоілі: падавацца можна не толькі ў ліпені, але і ў жніўні. А гэта вельмі зручна, бо шмат якія міжнародныя зборнікі выходзяць бліжэй да гэтага часу. Прызнаюся, што задумваўся пра зніжку, калі рыхтаваўся да сесіі. Пытанне аплаты цесна звязана з сям'ёй, бо як-ніяк менавіта бацькі плацяць за маё навучанне. І я разумею, што магу і павінен зрабіць усё, каб палегчыць гэты цяжар і паменшыць аплату. Гэта рэальна працуе і дапамагае мне і многім іншым таленавітым студэнтам БДУ.

**Вікторыя ВАРАНЧУК, студэнтка 4 курса эканамічнага факультэта. У 2019/2020 навучальным годзе дадзена зніжка 60 %:**



– Зніжку атрымліваю з другога курса кожны год. Заслужыла яе і ў гэты раз дзякуючы добрай вучобе, навуковай і грамадскай дзейнасці. Мой сярэдні бал за мінулы год – 9,2. Удзельнічала ў розных алімпіядах і праектах. Сярод іх міжнародная канферэнцыя маладых навукоўцаў «Банкаўскі бізнес і фінансавая эканоміка». Я лаўрэат конкурсу праектаў «Бізнес-ідэя» на ЭФ БДУ, удзельнічала ў праекце «Лабараторыя рознічных прадуктаў» (маркетынгавае даследаванне па замове аднаго банка). Зусім нядаўна атрымала сертыфікат на праходжанне практыкі ў «Белінвестбанку» за поспехі ў вучобе, даследчай дзейнасці. Так, вучыцца – гэта праца, але калі ты ў чымсьці зацікаўлены і хочаш дасягнуць мэты, то ўсё атрымаецца. Прыемна, што за твой вынік табе робяць зніжку па аплаце. Гэта дае матывацыю працаваць і ўдасканальвацца.

**Аліна БЯГЛЯК, студэнтка 4 курса эканамічнага факультэта. У 2019/2020 навучальным годзе дадзена зніжка 60 %:**



– Зніжку я атрымала на падставе добрага сярэдняга бала – 9,2 (гэта ўжо другі раз за перыяд вучобы). Але ў першую чаргу на глыбокае вывучэнне прадметаў мяне матывуе неабходнасць далейшага працаўладкавання, а атрыманне зніжкі з'яўляецца дадатковай матывацыяй. На працягу ўсяго года актыўна прымала ўдзел у грамадскай працы, навукова-даследчых праграмах, канферэнцыях. На дадзены момант я з'яўляюся старшынёй жыллёва-бытавой камісіі студэнцкага прафкама на эканамічным факультэце, а таксама выконваю абавязкі старшыні студэнцкай жыллёва-бытавой камісіі БДУ. Засяленне студэнтаў у інтэрнат займае нямала часу, гэта вялікая адказнасць, і, каб з усім справіцца, мне прыйшлося прыкласці намаганні.

**Падрыхтавала Алена ЛЯЎШЭНЯ**





Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА



# Выбарчае права: ад вытокаў у будучыню

Фота і відэа gazeta.bsu.by

Пачатак на 1-й стар.

## Як гэта – быць дэпутатам?

Лепш за ўсё пра выбарчыя працэсы і парламентарызм могуць распавесці самі дэпутаты. Сваім досведам падзялілася **Вольга ПАПКО** – намеснік старшыні пастаяннай камісіі ПП НС па міжнародных справах.

– Дэпутацкі тэрмін – гэта велізарны досвед працы, якога ў мяне не было нават за час майго кіраўніцтва музеем «Замкавы комплекс „Мір“» і выкладання ў Брэсцкім тэхнічным дзяржуніверсітэце. Даводзілася шмат вучыцца, паглыбляцца ў зусім розныя тэмы: ад распрацоўкі новага Працоўнага кодэкса да рашэння культурных і побытавых пытанняў насельніцтва. Якая роля жанчыны ў беларускай палітыцы? У нашым парламенце жанчын больш за 30 %, мы сапраўды аказваем вялікі ўплыў на прыняцце дзяржаўных законапраектаў, накіраваных на паляпшэнне жыцця людзей, а таксама на выбудоўванне міжнародных адносін. Студэнтам жадаю ставіць смелыя, глабальныя мэты! Нават калі вы іх не дасягняце, то набудзеце вялікі жыццёвы досвед, які спатрэбіцца ў прафесійнай кар'еры.

На адкрыцці выступіў **Сяргей МАСКЕВІЧ,** дырэктар МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ. У свой час ён узначальваў пастаянную камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ, а пасля займаў пасаду міністра адукацыі.

– Мне пашчасціла браць удзел у выбарах і як кіраўніку ВНУ – рэктару ГрДУ, і як кандыдату ў дэпутаты 3 і 4 скліканняў. Працуючы ў парламенце, мы адчуваем адказнасць: за цябе прагаласавалі тысячы грамадзян, і кожны спадзяецца ўбачыць вынікі тваёй працы, зразумець, праз які механізм ты можаш рэалізаваць яе. Роля БДУ як экспертнай супольнасці, якая ўцягнута ў працэсы грамадскай і прафесійнай экспертызы праектаў, у выбарчым працэсе каласальная. А крэатыўная моладзь заўсёды разглядае дадзеныя ініцыятывы праз іх рэальную карысць для грамадзян.

Вывучаць грамадскія навукі ва ўніверсітэце вельмі важна, незалежна ад спецыяльнасці. Яны вучаць інтэгральна глядзець на вынікі: бачыць агульныя заканамернасці, глабальныя працэсы і разумець, што твая дзейнасць павінна ім адпавядаць. Не ведаючы і не ўлічваючы сацыяльныя працэсы і заканамернасці, не сфарміраваўшы навуковую выяву свету, можна зрабіць шмат неэфектыўных крокаў, безвынікова выдаткаваўшы сілы і сродкі. Без разумення рэальных заканамернасцяў соцыуму ты не зможаш знайсці ў іх сваё месца.

## Персоны-эпохі

На выставе прадстаўлены агітацыйныя плакаты, бюлетэні, кнігі, выбарчыя дакументы, пасведчанні і нагрудныя значкі, асабістыя рэчы, фатаграфіі народных дэпутатаў БССР і выкладчыкаў БДУ. «Супрацоўнікі нашага ўніверсітэта заўсёды прымалі актыўны ўдзел у працы прадстаўнічых органаў краіны і выбарчых працэсах. Ордэнамі, узнагародамі, рэчамі з намі падзяліліся сем'і герояў выставы, некаторыя нават перадалі ў падарунак. Кожная асоба – гэта эпоха», – гаворыць **Эма МАЛІНОЎСКАЯ,** дырэктар музея гісторыі БДУ. Яна займалася распрацоўкай і напаўненнем выставы.

Сярод асоб-эпох шырока вядомыя афтальмолаг прафесар ***Таццяна Бірыч***, акадэмік ***Уладзімір Перцаў***, дзяржаўны дзеяч і дыпламат ***Ніна Мазай***. Апошнюю на адкрыцці ўспамінаў прафесар **Сяргей ХОДЗІН,** старшыня пярвічнай арганізацыі БДУ РГА «Белая Русь». Яна скончыла гістарычны факультэт БДУ, абіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і займала высокія пасады ў незалежнай Беларусі. «Зараз, на жаль, яна не можа быць з намі: 26 чэрвеня перастала біцца яе сэрца. Яна прыклад, як служыць Айчыне. Вельмі важна, каб гэтая пераемнасць, адказнасць за лёс універсітэта і краіны суправаджала маладое пакаленне і мы былі ўпэўнены ў будучыні», – з пачуццём прамовіў прафесар.

З цеплынёй і падзякай успомніў сваіх настаўнікаў і **Андрэй РУСАКОВІЧ,** загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы ФМА:

– Азнаёміўшыся з гэтай выставай, я звярнуў увагу на дзве персоны. Першая – навуковы кіраўнік маёй дыпломнай працы ***Леў Шнеерсон***, больш за 50 гадоў ён кіраваў кафедрай новай і найноўшай гісторыі. Яго лекцыі сталі класікай, ён успамінаў усе нюансы ён тэксту лекцыі, напрыклад, якая марка віна стаяла на перамовах 1878 года паміж Германіяй, Аўстра-Венгрыяй і Расіяй. Другая – ***Леанід Кісялеўскі***, рэктар БДУ, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Сваю прафесійную кар'еру я пачаў у перыяд яго рэктарства. Час быў складаны: пачатак перабудовы, шырокамаштабных пераўтварэнняў, якія прывялі да незалежнасці Беларусі. Я назіраў, як мудра і адказна тыя лідары падыходзілі да ўсіх працэсаў. Тады мы з цяперашнім дэканам юрфака ***Сяргеем Балашэнкам*** працавалі ў камсамоле, развівалі ідэі студэнцкага самакіравання, пашырэння ўдзелу студэнтаў у саветах факультэтаў. І так склалася, што 30 гадоў назад я студэнтам ужо быў членам савета ўніверсітэта і ўдзельнічаў у прыняцці сур'ёзных рашэнняў, якія і цяпер вызначаюць аблічча БДУ.

## Агіткі і муза Маякоўскага

Другі экспазіцыйны блок выставы прадстаўлены «агіткамі» – савецкімі агітацыйнымі жаночымі плакатамі, фатаграфіямі рэвалюцыйных і савецкіх актывістак, якія змагаліся за палітычныя і грамадзянскія правы жанчын. Сярод нашых суайчынніц ***Алаіза Пашкевіч***, ***Кацярына Брашко-Брашкоўская*** і ***Соф'я Шамардзіна***. Пра апошнюю распавяла цікавую гісторыю **Ірына КАЗАКОВА,** старшыня савета ГА «Саюз жанчын БДУ».

Вядомы паэт *Уладзімір Маякоўскі* быў закаханы ў *Соф'ю Шамардзіну*, а яна аддала перавагу беларусу *Іосіфу Адамовічу*, старшыні Савета Народных Камісараў, і ў Беларусі зрабіла вельмі шмат для развіцця жаночага руху. З крыўдай і захапленнем паэт называў яе «Сонька-жансавет». Яна і яе муж у Беларусі мелі такі ж статус, што Ленін і Крупская ў Маскве.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: крыніцазнаўства; этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: беларускага мовазнаўства; тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства; нямецкага мовазнаўства.

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ інфарматыкі і камп'ютарных сістэм.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**IV Міжнародны моладзевы форум «М.І.Р.: Моладзь. Інтэграцыя. Развіццё» адкрыўся ў БДУ** – БелТА (26.10), zviazda.by, АНТ (28.10).

**Цэнтр даследаванняў свету створаны ў БДУ** – БелТА, zviazda.by (24.10).

**БДУ і Белтэлерадыёкампанія запусцілі сумесны праект «Не вучы вучонага»** – zviazda.by, edu.gov.by, Беларусь-1 (24.10), «Звязда» (31.10).

**Студэнты БДУ ў складзе зборнай Беларусі перамаглі ў сусветных спаборніцтвах па робататэхніцы і праграмаванні FIRST Global Challenge** – Беларусь-1, naviny.by, TUT.BY (28.10), sb.by, zviazda.by, edu.gov.by, СТБ (29.10 ).

**Факультэт журналістыкі БДУ святкуе 75-годдзе** – БелТА, sb.by, АНТ, «Мінск-Навіны», «СБ. Беларусь сегодня», «Знамя юности» (31.10), Беларусь-1, Беларусь-24, «Спадарожнік» (01.11), СТБ (06.11), radio1.by (12.11).

**XVI Міжнародны фестываль студэнцкіх і моладзевых тэатраў «Тэатральны куфар, БДУ–2019» адкрыецца ў БДУ** – АНТ (31.10), «Інтэрфакс» (06.11), sb.by, «Народная газета» (09.11), zviazda.by (10.11), onliner.by (12.11), СТБ, Беларусь-24, aif.by, news.21.by (13.11).

**Выстава «Выбарчае права: ад вытокаў у будучыню» працуе ў БДУ** – zviazda.by (10.11), БелТА, радыё «Сталіца» (12.11), АНТ (13.11).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
25 лістапада 2019 года, № 14 (2220)

# Месца, дзе юнацтва распраўляе крылы!



Самы крэатыўны і малады душой факультэт святкуе сапраўдны юбілей! Якім быў і якім стаў за тры чвэрці стагоддзя адзіны ў краіне факультэт падрыхтоўкі прафесійных журналістаў, расказваюць дэканы і іх намеснікі.



**ВОЛЬГА МІХАЙЛАЎНА САМУСЕВІЧ**
**дэкан з ліпеня 2018 г.**

– Моц нашага факультэта – найперш у творчым адзінстве. Думаю, столькі таленавітых і незвычайных людзей, як у нас, няма больш ні на адным факультэце. Сённяшні журфак бадзёры, рашучы, актыўны, патрыятычны, талерантны, гасцінны. І ён, як і было заўжды, малады духам. Наш факультэт – жывы арганізм, які ніколі не спыняецца і, я веру, не спыніцца ў развіцці. Мы пашыраем міжнародныя сувязі, плануем сумесныя навучальныя праграмы з установамі вышэйшай адукацыі іншых краін, новыя праграмы ў магістратуры, а таксама новыя профілі падрыхтоўкі на I ступені вышэйшай адукацыі, звязаныя з лічбавымі тэхналогіямі, SMM, блогінгам. Эўрыстычныя, інавацыйныя прынцыпы навучання, прымяненне шырокага спектра тэхнічных сродкаў знаходзяцца ў звязку з тэхніка-тэхналагічнымі кампетэнцыямі, якімі авалодваюць нашы выпускнікі. Бо журналістыка – гэта сфера, якой трэба быць у рытме часу не толькі сёння і зараз, але і заўтра.

Жадаю студэнтам не расчароўвацца ў зробленым выбары! Шаноўным выкладчыкам натхнення і здароўя для плённай працы! Жадаю нашым ветэранам доўгіх гадоў жыцця! Вельмі хачу, каб нашы выпускнікі ніколі не здраджвалі сваёй прафесіі і аддана служылі людзям і краіне ў інфармацыйнай прасторы!



**СЯРГЕЙ ВАЛЯНЦІНАВІЧ ДУБОВІК**
**дэкан з 2005 па 2018 гг.**

– Журфак – гэта якасная падрыхтоўка прафесійных журналістаў. Пасля пераезду ў 2008 годзе ў новы будынак на вуліцу Кальварыйскую факультэт атрымаў новае дыханне, новы статус набыла і міжнародная канферэнцыя «Беларуская журналістыка», якая распачала сваю дзейнасць у 1998 г. як пляцоўка апрабацыі вынікаў навуковых даследаванняў у галіне журналістыкі. У двухтысячныя гады на факультэце журналістыкі былі пашыраны спецыяльнасці па падрыхтоўцы студэнтаў, а гэта вэб-журналістыка, менеджмент СМІ, літаратурная работа (творчасць). Вядома, у гэтым заслуга працоўнага калектыву, без творчага запалу і ініцыятывы якога нічога не атрымалася б. Дарэчы, са спецыяльнасцю «вэб-журналістыка» мы паспелі своечасова, бо само жыццё прадыктавала неабходнасць у падрыхтоўцы такіх спецыялістаў. Лічу, што зараз падрыхтоўку студэнтаў трэба весці ў кірунку вузкай спецыялізацыі. Жадаю факультэту журналістыкі далейшых поспехаў, росквіту і быць прыкладам для падобных факультэтаў як блізкага, так і далёкага замежжа!



**ВАСІЛЬ ПЯТРОВІЧ ВАРАБ'ЁЎ**
**дэкан з 1997 па 2005 гг.**

– Захоўваць традыцыі, закладзеныя ў 60–70-я гады, актыўна дапамагалі ветэраны журфака Б. В. Стральцоў, Е. Л. Бондарава, М. Я. Цікоцкі, А. А. Рудэнка. Захаванне традыцый, відаць, самае плённае пачынанне, якое павінна працягвацца бясконца. У 90-я гады на факультэце з'явілася каманда маладых, таленавітых, адукаваных людзей, якія змаглі, па-першае, стварыць у 1998 г. савет па абароне доктарскіх дысертацый, і ў гэтым савеце ўпершыню на факультэце журналістыкі былі абаронены дысертацыі Т. Д. Арловай, Т. М. Дасаевай, Н. Ц. Фральцовай, В. І. Іўчанкавым. Падругое, наш факультэт першым у рэспубліцы ўкараніў рэйтынгавую сістэму, а ў 2001 г. у эксперыментальным парадку перайшоў на двухузроўневую сістэму адукацыі: бакалаўрыят і магістратура. Шматлікія змены на нашым факультэце без падтрымкі кіраўніцтва ўніверсітэта зрабіць было б немагчыма: адкрыццё пяці спецыяльнасцяў, чатырох новых кафедраў, цэнтра камунікацыйных тэхналогій.

Зараз заўважаю, што студэнты ў многім зьмяняюцца да лепшага. Але ёсць і рысы дастаткова праблемныя: ім не хапае матывацыі ў навучанні, не заўсёды могуць абгрунтаваць выбар напрамку ў сваёй прафесіі. Для мяне ж журфак – гэта лёс, жыццё, творчыя пачаткі.



**ПЁТР ЛЕАНІДАВІЧ ДАРАШЧОНАК**
**дэкан у 1996 г.**

– Факультэт журналістыкі напрыканцы XX стагоддзя размяшчаўся ў корпусе на вуліцы Маскоўскай, 15. Магчымасцяў для таго, каб весці паўнавартасны вучэбны працэс, было значна менш. На аднаго студэнта прыходзілася каля аднаго квадратнага метра вучэбных плошчаў. Паточныя лекцыі чыталі і ў актавай зале, хоць гэта было і нязручна, але студэнты таго часу нас добра разумелі. Большасць з іх былі вельмі матываванымі, актыўна вывучалі дысцыпліны, нягледзячы на дэфіцыт новых падручнікаў, бралі ўдзел у факультэцкіх і ўніверсітэцкіх мерапрыемствах. А яшчэ ездзілі на бульбу, праводзілі медыумы, выступалі з творчымі справаздачамі на канферэнцыях па практыцы, супрацоўнічалі з рэдакцыямі СМІ, выпускалі вучэбную газету «Журналіст».

Ахвочы, цікаўны, здольны студэнт заўсёды будзе ўплываць на прафесійнае развіццё выкладчыка. Тут галоўнае не спачываць на лаўрах, а ледзь не кожны дзень адшукваць нешта новае, невядомае, чым можна зацікавіць сучаснага студэнта, які ні на хвіліну не расстаецца са смартфонам. Прыемна, што на факультэце перадаецца з пакалення ў пакаленне цудоўны сплаў таленту і працавітасці, які дазваляе студэнтам аднасіцца да прафесіі журналіста з высокай адказнасцю, старанна вучыцца майстэрству слова.



**АЛЕГ ГЕОРГІЕВІЧ СЛУКА**
**дэкан з 1986 па 1996 гг.**

– Для мяне факультэт журналістыкі – гэта звышвялікая платформа жыццёвай творчасці і пачэснага служэння Радзіме. Падчас майго кіравання факультэтам быў рэвалюцыйны час, калі ў СССР і Рэспубліцы Беларусь адбываліся перамены грамадска-палітычнага ладу. Журфак успрыняў і развіваў дэмакратычныя пераўтварэнні ў свабоднай беларускай дзяржаве. Удзяльнічаў у стварэнні новай інфармацыйнай эпохі. Распачаў сучасную падрыхтоўку кадраў на аснове аб'ектыўна-гістарычнай метадалогіі. Як інстытут сацыяльна-палітычнай камунікацыі ў сваёй грамадскай і акадэмічнай дзейнасці арганічна спалучаўся з новай рэальнасцю.

Сённяшні факультэт застаецца моцным цэнтрам падрыхтоўкі не толькі прафесійных журналісцкіх кадраў, што шчыруюць у друку, на тэлебачанні і ў лічбавай медыяпрасторы, але і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пра гэта сведчыць колькасць і, галоўнае, якасць абарон кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый за апошнія гады.

Жадаю табе, мой факультэт, заўсёды заставацца гарантам высакаякаснай прафесійнай адукацыі на прасторы СНД!














ФОТА АЛЯКСАНДРА ЗАПОЛЬСКАГА, ДАР'І ФУРСІКАВАЙ, КАЦЯРЫНЫ ГУРТАВОЙ



**АНГЕЛІНА АЛЯКСАНДРАЎНА РУДЭНКА**
**намеснік дэкана ў 1986–2005 гады**

– Шчыра рада павіншаваць факультэт з 75-гадовым юбілеем. Адпрацаваўшы амаль 50 гадоў на ім, магу сказаць, што на працягу ўсяго часу тут не толькі рыхтавалі майстроў пяра і слова, але і фарміравалі асаблівы стан душы, у аснове якога былі пачуццё справядлівасці, шчырасці, катэгарычнае непрыманне коснасці. І галоўнае, што аб'ядноўвала нас – выкладчыкаў, студэнтаў, журналістаў вядучых сродкаў масавай інфармацыі, – атмасфера творчага пошуку.

Узгадваюцца 80-я гады. Яшчэ зусім малады факультэт прымае на навучанне прадстаўнікоў моладзі з 51 краіны Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі (каля 200 чалавек). І калектыў выкладчыкаў уключаецца (я б сказала, самааддана) у падрыхтоўку журналістаў для гэтых краін. Карэкціруюцца рабочыя планы, да адукацыйнага працэсу прыцягваюцца журналісты-міжнароднікі, выкладчыкі іншых вышэйшых навучальных устаноў.

Сёння выпускнікоў нашага факультэта можна сустрэць у розных кропках планеты. В'етнамскія выпускнікі, якія сталі ля вытокаў журфака ў Ханойскім універсітэце, з гонарам адгукаюцца пра «мінскую школу журналіста».



**ІВАН ІВАНАВІЧ САЧАНКА**
**намеснік дэкана ў 1978–1986 гады**

– Сёння, бадай што, нельга назваць спецыяльнасць на журфаку, якая б нараджалася з такой працяглацю ў часе і вострых дыскусіях на розных узроўнях, як «міжнародная журналістыка». Прафесійныя кодэксы і творчая этыка журналістаў-міжнароднікаў былі найважнейшымі інструментамі вострых спрэчак на пасяджэннях вучоных саветаў, дэканатаў і кафедраў. Вырашыць праблему адкрыцця новай спецыяльнасці ўдалося не з першага і нават не з другога заходу па кабінетах міністэрстваў фінансаў, эканомікі і адукацыі. Затым узніклі новыя складанасці – трэба было распрацаваць праграмы, планы, напісаць кваліфікацыйную характарыстыку, падабраць адпаведныя кадры. Асабліва востра паўстала праблема з праходжаннем практыкі студэнтаў-міжнароднікаў. Хочацца пажадаць сучасным студэнтам-міжнароднікам і іх выкладчыкам значных поспехаў і настойлівасці пры дасягненні мэт.

## Журфак у лічбах

(даныя на лістапад 2019 г.)

**10 188**

выпускнікоў з **65** краін свету за 75 гадоў

**111**

выкладчыкаў. З іх: **34** мужчыны, **77** жанчын

**6** дактароў навук**, 57** кандыдатаў навук, **40** аспірантаў, **7** дактарантаў

**26**

дысертацый абаронена з 2010 г., з іх **23** – кандыдацкія, **3** – доктарскія

**945**

студэнтаў. З іх: **234** юнакі, **711** дзяўчат

З іх: **874** чалавекі на І ступені вышэйшай адукацыі, **71** – на ІІ ступені

**204**

замежныя студэнты, з іх **176** грамадзян КНР

# А што скажа студактыў?



**Карына ГУРЭВІЧ, студэнтка 4 курса спецыяльнасці «журналістыка (друкаваныя СМІ)», старшыня савета старост факультэта журналістыкі БДУ**

– Я ніколі не шкадавала, што паступіла на факультэт журналістыкі, бо гэта выдатнае месца для станаўлення асобы. Не важна, будзеш ты пісаць ці пойдзеш іграць на сцэну тэатра, у сценах журфака можна знайсці неабходную для гэтага энергію. Большую частку часу ў мяне займаў актыў савета старастаў і творчага саюза.

Многія думаюць, што стараста толькі запаўняе журнал, але на самой справе ён адказны за кожнага ў сваёй групе. А старшыня старастата – яшчэ і за кожнага старасту на факультэце.

У апошнія тыдні я часта ўспамінаю, што больш за ўсё люблю на журфаку: размаўляць з сябрамі ў холе 3 паверха, гутарыць з выкладчыкамі на цікавыя тэмы, а яшчэ глядзець, як ліхтары на вуліцы асвятляюць увечары кабінеты – гэта вельмі прыгожа.

Не ведаю, 75 – шмат ці мала, але наперадзе хапае часу, каб высветліць тое!



**Максім ЦЮЦЯНЬКОЎ, студэнт 3 курса спецыяльнасці «літаратурная работа (рэдагаванне)», старшыня прафбюро студэнтаў журфака БДУ**

– Факультэт журналістыкі – гэта месца, куды хочацца прыходзіць зноў і зноў. Тут свая ўтульная, нават хатняя, атмасфера: студэнт першага курса можа спакойна звярнуцца да чацвёртакурсніка, а той абавязкова дапаможа. Таксама можна падыйсці да выкладчыкаў, якія заўсёды дадуць слушную параду.

Тут я пасталеў, навучыўся расстаўляць прыярытэты, стаў больш упэўненым у прыняцці рашэнняў. У гэтых сценах я атрымліваю не толькі адукацыю, але і развіваю свае лідарскія якасці.

Прафкам – гэта вялікі і дружны калектыў, які заўсёды працуе для сваіх студэнтаў. Гэтая арганізацыя стала ладам майго жыцця. Яна навучыла не адкладаць нічога на заўтра і не спыняцца на дасягнутым.



**Алена ДАВІДОВІЧ, студэнтка 4 курса спецыяльнасці «журналістыка (аўдыявізуальная)», старшыня творчага саюза факультэта журналістыкі БДУ**

– Творчы саюз журфака штогод ладзіць ужо традыцыйны «Караоке-батл на журфаку», дзе кафедральныя каманды, якія складаюцца з выкладчыкаў і студэнтаў, змагаюцца за званне самай спяваючай кафедры. Гэта мерапрыемства дапамагае студэнтам і выкладчыкам крыху бліжэй пазнаёміцца за межамі аўдыторных заняткаў. Таксама мы арганізоўваем выніковы фестываль «ЖГ!», дзе ўзнагароджваем тых студэнтаў і выкладчыкаў, хто нечым вызначаецца ў навуковай і творчай дзейнасці па выніках адкрытага галасавання саміх жа студэнтаў і выкладчыкаў. Таксама ў межах мерапрыемства вылучаем найлепшы праект, рэалізаваны на факультэце.

Зусім хутка, 26–28 лістапада, пройдзе чацвёрты міжуніверсітэцкі паэтычны форум, дзе будуць прадстаўлены тры намінацыі: «Чытальнік» (выкананне твора няўласнага сачынення), «Аўтар-выканаўца» (выкананне твора ўласнага сачынення) і новая намінацыя «Аўтарская песня» (выкананне музычнага твора ўласнага сачынення). У форуме могуць прымаць удзел студэнты і магістранты ўсіх вышэйшых і сярэднеспецыяльных навучальных устаноў Беларусі. І, вядома ж, ладзім разнастайныя майстар-класы ад людзей, якія дасягнулі поспехаў у творчай дзейнасці.

Лічу, што журфак – гэта месца, дзе можна рэалізаваць свой патэнцыял у разнастайных галінах, няхай гэта будзе творчасць або навука, кожны знойдзе занятак даспадобы. Тут творчасць не мае межаў.

**Матэрыялы развароту падрыхтавалі Вольга КАСПЯРОВІЧ, Наталля ЗУБЧОНАК**

УНІВЕРСІТЭТ
25 лістапада 2019 года, № 14 (2220)

# Трэнды ў навучанні бізнесменаў



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

**БДУ прыняў удзел у міжнародным праекце «Інтэграцыя беларускай бізнес-адукацыі ў рэгіёне Балтыйскага мора, у межах якога даследавалі прафесійную дзейнасць выпускнікоў, а таксама выявілі, што і як неабходна палепшыць у падрыхтоўцы такіх спецыялістаў.**

Мэтай міжнароднага праекта стала вывучэнне запатрабаванняў бізнес-адукацыі ў Беларусі, каб распрацаваць перадавыя мадэлі адукацыйных праграм у галіне бізнесу і прадпрымальніцтва. Кансорцыум складаўся з БДУ, UNECON, Латвійскага ўніверсітэта, Берлінскай школы эканомікі і права і Універсітэта Турку. Праект рэалізаваны сумесна з Саветам дзяржаў Балтыйскага мора (Швецыя), які спрыяе супрацоўніцтву краін у сферы адукацыі, культуры, эканамічнага развіцця, грамадзянскай бяспекі.

Пра этапы рэалізацыі і галоўныя вынікі праекта распавёў начальнік аддзела міжнародных праграм і праектаў УМС **Аляксандр РЫТАЎ**: «На БДУ была ўскладзена адследчая місія і апрабацыя вынікаў. Мы аналізавалі стан бізнес-навучання ў Беларусі. Паводле даведніка ўстаноў вышэйшай адукацыі, у краіне гэты кірунак адукацыі адносіцца да катэгорыі Е і пералічваецца разам з камунікацыямі і дзяржкіраваннем. Дадзеная група дае амаль 40 % ад усёй колькасці навучэнцаў, каля 30 % ад агульнага ліку – будучыя эканамісты-менеджары. З іх на І ступені ў дзяржаўных ВНУ да 50 % слухачоў навучаюцца на завочнай форме, на ІІ ступені да – 70 %. А ў прыватных ВНУ такія прапорцыі яшчэ вышэйшыя. Гэта гаворыць пра тое, што слухачы бізнес-акадэміі або перавучваюцца, або ўжо працуюць у сферы. З майго пункта гледжання, калі мы думаем пра развіццё бізнес-адукацыі, трэба разумець, што праграмы павінны быць для такой аўдыторыі кароткімі, дыстанцыйнымі і практыка-арыентаванымі».

Як паказаў аналіз, наймацнейшым у плане падрыхтоўкі стаў Інстытут бізнесу БДУ. За ім ідуць БДЭУ, БНТУ. З прыватных – Гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкаапераціі, МІПСА. Ёсць другая катэгорыя – розныя прыватныя арганізацыі, якія займаюцца адукацыйнай дзейнасцю. Але далёка не кожная з іх мае ліцэнзію на ажыццяўленне дадатковай адукацыі. Шмат з іх з'яўляюцца проста кансультатыўнымі кампаніямі, якія пад замежнай франшызай часта прапануюць нятанныя праграмы. Таму часам выданыя дыпломы нелегітымныя, але бізнесу патрэбныя кампетэнцыі, з-за чаго такія структуры, якія больш нагадваюць фармат курсаў, карыстаюцца попытам.

«Міністэрства фінансаў, Асацыяцыя бізнес-адукацыі робіць розныя падлікі аб'ёмаў фінансаў. Экспертная ацэнка і наш уласны аналіз гавораць, што каля 30 мільёнаў руб. знаходзіцца ў асяроддзі бізнес-адукацыі. Больш за 70 % навучэнцаў у сферы плацяць за навучанне. Гэта запатрабаваны сектар, які павялічваецца з году ў год», – тлумачыць начальнік аддзела УМС і дадае, што справа не ў колькасці, а ў якасці. Трэба выпускаць не вялікую колькасць спецыялістаў, а рыхтаваць больш дасведчаных выпускнікоў.

Другая частка справаздачы была прысвечана аналізу працоўнай і прафесійнай дзейнасці выпускнікоў беларускіх ВНУ. Аналіз грунтаваўся на даследаванні прадпрымальніцкага патэнцыялу студэнтаў у рамках рэалізацыі эксперыментальнага праекта «Універсітэт 3.0» (РІВШ), на дадзеных праекта «Эразмус+» FOSTERC (БДУ).

Наколькі навучэнцы гатовыя займацца бізнесам, якіх уменняў ім бракуе? Было праведзена параўнанне адказаў выпускнікоў групы бізнес-адукацыі і ўсіх астатніх катэгорый. Метадалогію рыхтавалі калегі з Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ. Апыталі анлайн каля 5,5 тыс. рэспандэнтаў. Ім было прапанавана ацаніць сфарміраванасць звыш 20 кампетэнцый. Яны адказвалі, наколькі ў іх склаліся навыкі падчас навучання, ацэньвалі, наколькі яны важныя ў працоўнай дзейнасці. Розніца паміж ацэнкамі гаворыць пра ступень развіцця кампетэнцый. Адзначаецца, што 100 % сфарміраванасці навыку не сустрэлася.

«Параўнанне паказала, што ў выпускнікоў бізнес-праграм лепш развітыя арганізацыйная, інавацыйная, камунікацыйная кампетэнцыі. Таксама яны валодаюць замежнымі мовамі лепш, чым уся група рэспандэнтаў. На дзіва, у цэлым усім выпускнікам малаважныя веды замежнай мовы, таму што большасць застаецца працаваць у нацыянальных межах. Выпускнікі бізнес-праграм прызналіся, што ў іх кіраўнічая кампетэнцыя недастаткова развітая. Некаторыя разумеюць, што не могуць кіраваць, выразна данесці заданні падначаленым. Мы ўбачылі ў гэтым задачу – развіць уменне кіраваць і працаваць у камандзе. І лепш з такім заданнем справіцца мадэль актыўнага навучання. Трэба вызначыць, якія адукацыйныя кампаненты могуць выкарыстоўвацца, каб скараціць разрыў паміж сфарміраванымі і неабходнымі кампетэнцыямі», – мяркуе Аляксандр Уладзіміравіч.

Значным мерапрыемствам праекта стала арганізацыя ў БДУ міжнароднай летняй школы BEST – business education sprint. У яе працы прынялі ўдзел 30 выкладчыкаў з 14 універсітэтаў Беларусі, Расіі, Германіі, Фінляндыі, Латвіі. Ад БДУ навучанне ў школе прайшлі 7 выкладчыкаў эканамічнага факультэта і факультэта міжнародных адносін.

Фармат навучання: design-sprint у варыянце Google Ventures (ідэі з бізнесу прасочваюцца ў навучанне). Метадалогія навучання – дызайн-мысленне, якое ўключае такія ступені: даследаванне, распрацоўка, прататыпіраванне, тэсціраванне, адаптацыя. За пяць дзён 5 груп прапрацоўвалі 5 этапаў. Кожны дзень быў падзелены на кароткія інтэрактыўныя раздзелы навучання і на рэальныя інавацыйныя дзеянні. Вынікам інтэнсіўнай калектыўнай працы сталі 5 праграм бізнес-навучання ў галіне кіравання ІТ-інфраструктурай, event-менеджменту і інш.

«Усе азадачаны зменай зместу навучання. Думаецца, мы па-іншаму сканструюем навучальны план, дададзім туды новыя дысцыпліны. Але мне здаецца, дысцыпліны ў нас добрыя. Варта задумацца пра змену спосабу падачы матэрыялу. Пераход да актыўных метадаў выкладання – гэта эфектыўны агульнаеўрапейскі трэнд», – лічыць Аляксандр Рытаў.

Міжнародны праект дапамог стварыць умовы для распаўсюджання перадавых падыходаў у сферы навучання прадпрымальнікаў. Таксама тут з'явіўся дадатковы эфект – сфарміравалася сетка нацыянальных экспертаў у галіне бізнес-адукацыі.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

# Бясплатная рэклама: аўтарскія профілі для паспяховай навуковай дзейнасці

**Публікацыйная стратэгія навукоўца даўно не абмяжоўваецца стварэннем якаснага прадукту. Даследчык павінен не толькі апублікавацца (пажадана ў высакарэйтынгавым часопісе), але і выканаць працу па распаўсюджванні. Бо, калі публікацыю не заўважаць, яе не працытуюць, і тады пад пытаннем паспяховасць самога навукоўца. Разбіраемся са спецыялістамі, навошта навукоўцу заводзіць аўтарскія профілі.**

## Быць канкурэнтаздольным

– Цяпер у навуцы даволі высокая канкурэнцыя. Па жыцці мы можам быць выдатнымі фермерамі і вырошчваць цудоўныя яблыкі, але ніхто не ацэніць нашу працу, пакуль мы іх не прададзім. А як прадаць? Вядома, можна рабіць гэта ва ўласным садзе, але тады вялікая верагоднасць, што большасць пакупнікоў пройдзе міма. Хутчэй за ўсё наша мэтавая аўдыторыя будзе на рынку, там шанцаў прадаць больш, – тлумачыць **Ірына Ціханкова**, спецыяліст па навучанні кампаніі Clarivate Analytics. – Тое самае і з навуковымі публікацыямі: мала напісаць добры артыкул, трэба зрабіць так, каб яго заўважалі. Для гэтага і існуюць аўтарскія профілі – сукупнасць інфармацыі пра аўтара і яго навуковыя публікацыі ў навукаметрычных базах дадзеных.

## Сабраць усе свае працы

– Важна сабраць у адным аўтарскім профілі ўсе свае публікацыі – гэта дазволіць у тым ліку карэктна палічыць індэкс Хірша. Дарэчы, калі ў вас ёсць публікацыі, зробленыя 5–10 гадоў таму (тады яшчэ не так былі распаўсюджаны электронныя часопісы), то вы як аўтар можаце свае працы аблічбаваць і размясціць іх у аўтарскіх профілях.

## Вырашыць праблему з цёзкамі

– Адна з праблем аўтаматычнага звязвання аўтара і яго профілю ў тым, што ў многіх з нас ёсць цёзкі, ёсць розныя варыянты транслітарацыі, што асабліва актуальна для беларускай і украінскай моў, жанчыны змяняюць прозвішчы. Аўтарскі профіль дае аўтару магчымасць самому рэдагаваць дадзеныя пра свае публікацыі. Ён можа ўбачыць увесь спіс сваіх прац, якія сістэма аўтаматычна ідэнтыфікавала пад яго імем, паказаць для сістэмы розныя варыянты ўласнага імя і прозвішча, прывязаць да свайго профілю тыя публікацыі, якія не былі аўтаматычна прывязаны.

## ResearcherID пачаў улічваць рэцэнзіі

– Увесну гэтага года ResearcherID быў перанесены на новую платформу Publons – аб'яднаны профіль даследчыка. Гэты рэсурс дазваляе адзначыць вашу працу не толькі як навукоўца, але і як рэцэнзента. Калі артыкул прыходзіць на рэцэнзаванне, навуковец пачынае яго чытаць, штосьці ў яго можа выклікаць сумневы, тады даводзіцца звяртацца да дадатковай літаратуры. У выніку можа сысці тыдзень на хоць і цікавы, але доўгі навуковы пошук. А пасля трэба яшчэ час, каб напісаць саму рэцэнзію. Гэта сур'ёзная праца, якая раней нідзе не ўлічвалася. Зараз жа ў профілі адлюстроўваецца інфармацыя пра колькасць рэцэнзій, якія зрабіў навуковец у міжнародных часопісах. У выніку, калі вы, напрыклад, падаеце грантавую заяўку і паказваеце ў ёй свой ResearcherID, – бачныя і вашы артыкулы, і тое, што вы выступаеце як рэцэнзент. Гэта, натуральна, павышае ў вас як навукоўца ўзровень даверу.

## Як выйсці з нуля на індэкс Хірша 10?

– Для таго, каб атрымаць бачнасць і пазнавальнасць у навуковым свеце, трэба, каб цябе хтосьці прачытаў, а яшчэ лепш – працытаваў. Неяк я паставіў эксперымент, – распавядае **Дзмітрый Лук'янаў**, дацэнт кафедры агульнай і клінічнай псіхалогіі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ. – За пяць гадоў з нуля выйсці на індэкс Хірша 10. Умова эксперыменту заключалася ў тым, каб размяшчаць свае працы менавіта ў найбуйнейшай навуковай сацыяльнай сетцы ResearchGate, гэта значыць важна было патрапіць туды, дзе цябе пачнуць чытаць. Вядома, я не проста размяшчаў там інфармацыю – я пачаў пра яе гаварыць. Напрыклад, я распавядаў пра свой профіль на канферэнцыях: устаўляў у канцы прэзентацыі QR-код, а пасля выступлення размяшчаў навіну пра іх у Facebook са спасылкай на тэкст публікацыі ў ResearchGate. Таксама можна знайсці ў сетцы сваіх калегаў і пачаць з імі камунікаваць, чытаць і каментаваць іх працы. Гэта прыводзіць да навуковых дыскусій, людзі, з якімі вы размаўляеце, захочуць пайсці і пачытаць вашы даследаванні. Мой эксперымент стаў паспяховым, хоць я проста дзяліўся тым, што раблю. Таму заводзьце свой профіль, напаўняйце яго унікальным і цікавымі кантэнтам і падтрымлівайце, каб ён не памёр ад недахопу ўвагі, як тамагочы.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

*Дапаможа ў стварэнні аўтарскага профілю аддзел інфармацыйнага суправаджэння публікацыйнай дзейнасці Фундаментальнай бібліятэкі БДУ (гал. корпус, каб. 206).*

# Раўшэн Атаеў:
# «Вучыцца на адны дзясяткі рэальна!»

**Бездакорны выдатнік Раўшэн АТАЕЎ – магістрант механіка-матэматычнага факультэта, прыехаў вучыцца ў БДУ са сталіцы Туркменістана. Усе сесіі студэнт здаў на дзясяткі, сёлета ён скончыў навучанне і паступіў у магістратуру. Юнак падзяліўся рэцэптам поспеху ў вучобе і распавёў, навошта патрэбная ўсвядомленасць і паслядоўнасць.**


Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

*Раўшэн Атаеў з рэктарам Андрэем Каралём падчас сустрэчы з найлепшымі выпускнікамі БДУ*

Раўшэн прызнаецца: адразу разумеў, што вышэйшую адукацыю будзе атрымліваць за мяжой. «У нас яна не вельмі добрая, да таго ж на дзяржаўнай мове – туркменскай. У гэтым асноўная складанасць: я гаварыў на рускай і з бацькамі, і ў школе. На туркменскай я размаўляў толькі з дзядулем, некаторымі дзецьмі. Не тое каб мова цяжкая, проста практыкі не было, цяпер наогул мову гэту дрэнна памятаю. З туркменамі, якія тут вучацца, я размаўляю на рускай», – гаворыць ён.

Пасля бакалаўрыяту студэнт атрымаў дыплом матэматыка-прыкладніка. Але вяртацца дахаты ён не плануе: наперадзе два гады навучання ў магістратуры.

## Чым адрозніваецца мехмат ад БНТУ?

Дома Раўшэн не быў тры гады. Пасля першага курса злятаў дахаты, пасля другога не захацеў – ваенкамат часта ладзіць «сюрпрызы», таму да юнака прыехаў бацька. Дарэчы, ён архітэктар, ад яго Раўшэн з братам, які заканчвае БНТУ, і атрымалі прасторавае мысленне. Яно асноўнае ў механіцы: трэба выразна ўяўляць, як механізм будзе выглядаць і працаваць, калі яго павярнуць ці пакруціць. «У БНТУ вучацца непасрэдна інжынеры-практыкі, якія будуюць дамы, трактары. Правучыўшыся чатыры гады ў БДУ на мехмаце, магу сказаць, што гэта навучанне бліжэйшае да матэматыкі, чым да механікі, тут упор ідзе на фундаментальныя навукі. У мяне навуковы вобраз мыслення і схільнасць да даследаванняў, таму тут мне падабаецца. Матэматыка ж таксама розная бывае: для праграмавання, механікі. Некаторыя выкладчыкі і навукоўцы ўсё жыццё адно ўраўненне вывучаюць. Такая вузкая скіраванасць мяне не адштурхоўвае, але пакуль я не знайшоў тое, што хацеў бы так вывучаць. Мне падабаецца біямеханіка, мой навуковы кіраўнік ёй займаецца, робіць пратэзы. З-за таго, што гэта вузкая спецыяльнасць, яна не так даступная, хоць тых, хто мае патрэбу, шмат. Механіка дазваляе эрганамічна спраектаваць пратэз, пратэсціраваць нагрузку на арганізм і найбліжэйшыя органы. Люблю практычны бок, я не прыхільнік „голай“ тэорыі, хоць дыплом у мяне на такую тэму», – тлумачыць туркменскі студэнт.

## Туркменскія дарогі, кітайскія вакацыі і хатняя зацішнасць

Пасля трэцяга курса Раўшэн паляцеў на месяц на стажыроўку ў Кітай: яе арганізаваў Сумесны інстытут БДУ і Далянскага тэхнічнага ўніверсітэта. «Мы былі першай эксперыментальнай групай, менш за дваццаць чалавек. Адна палова з мехмата, іншая – фізікі, і адзін студэнт з хімфака. Галоўным чынам мы вывучалі тэхнічную англійскую мову і праграмаванне, было некалькі лекцый па механіцы. Я пазнаёміўся з кітайскімі студэнтамі, у мяне быў свой моўны партнёр. Адзін выкладчык быў нават з Амерыкі – з Тэхаса», – дзеліцца ён уражаннямі.

З экалогіяй у Даляні лепей, чым у іншых рэгіёнах Кітая. Горад знаходзіцца каля акіяна, літаральна дзесяць хвілін – і ты ў салёнай вадзе – прыгадаў Раўшэн.

«Па прыездзе ў Беларусь складана было пераходзіць дарогу. Тут усё па правілах, а ў Туркменістане нават калі па пераходзе пойдзеш, усё адно можа машына збіць, – смяецца хлопец. – Калі я пасля першага курса вярнуўся дахаты і па звычцы пайшоў па пераходзе на зялёнае, ледзь паспеў ухіліцца ад машыны. А ў Кітаі наогул пешаходы пераходзяць дарогу, дзе хочуць! У Беларусі нашмат больш бяспечна», – робіць ён выснову.

Стрыечныя браты Раўшэна вучацца ў БНТУ, першы ажаніўся з беларускай дзяўчынай, яму 26 гадоў. Магістрант часта заязджае да іх, а вольны час праводзіць з сябрамі з універсітэта. «Я камфортна пачуваюся ў адзіноце, магу тры–чатыры дні спакойна пабыць адзін у інтэрнаце. Неяк вырашаў адно ўраўненне восем гадзін, час праляцеў так неўзаметку, што я не паспеў апамятацца, як надышоў вечар», – смяецца ён.

## У кожнай магчымасці свой знаўца

Радуе хлопца і свабодны інтэрнэт. У Туркменістане доступ да большасці самых папулярных сайтаў абмежаваны: гэта «Укантакце», Facebook, Twitter, «Аднакласнікі» і інш. Адзін час выкарыстоўвалі кітайскія месенджары, пакуль нядаўна не адкрылі Skype.

Тыя, хто стараецца, нядрэнна зарабляюць і запатрабаваныя, аднак туркменская моладзь бывае разгубленая. «Мой стрыечны брат інжынер-эканаміст у энергетычнай галіне, тры гады таму скончыў БНТУ, вярнуўся, два гады адслужыў, і вось толькі нядаўна знайшоў працу», – дзеліцца Раўшэн. – А ў Беларусі, калі захочаш і прыкладзеш намаганні, знойдзеш працу, у нас жа з гэтым ёсць пытанні – проста няма вакансій».

«Гэта плюс, што я прыехаў сюды, цаню ўсе магчымасці. Але галоўнае – не паддасца спакусе „лёгкага“ жыцця з начнымі клубамі. У мяне галава ў парадку, я не хадзіў на такія тусоўкі, першыя два гады быў страх, што калі пачнеш так жыць, то не выберашся. А калі на трэцім курсе, ужо маральна саспелы, пайшоў, было нецікава», – успамінае Раўшэн.

Студэнт адзначае, што адрозненні паміж нашымі культурамі не такія моцныя. За час навучання тут ён зусім асвоіўся. Раўшэн стаў гаварыць павольней, расцягваючы галосныя на манер беларусаў. А вось застацца жыць у Беларусі... «Тут шмат магчымасцяў для росту. Мне ёсць з чым параўноўваць! Вядома, добра, і можна застацца, падарожнічаючы пры гэтым па свеце. Чалавеку заўсёды хочацца большага, чаго б ён ні дамогся. Яно і натуральна, бо разумныя людзі імкнуцца да развіцця, удасканалення», – разважае хлопец.

## Дысцыпліна і рух

Раўшэн жыве ў інтэрнаце № 7, і вось ужо тры гады супрацоўнік аператрада. Дарэчы, у ім ён адзіны замежнік. «Спачатку я быў у студсавеце, але гэта адчувальна адбівалася на вучобе, і часу асабліва не было. Я ўвесь дзень на нагах: трэніроўка, потым вучоба, вольны толькі ўвечар», – гаворыць ён. На дзяжурствах і абходах адказныя студэнты сочаць за парадкам. Ад такой працы ёсць плюсы: Раўшэн жыве ў кампактным блоку кватэрнага тыпу з кухняй. Першы год яму было цяжкавата заходзіць да незнаёмых людзей, але дзякуючы гэтаму хлопец навучыўся свабодна размаўляць з незнаёмцамі. Зараз практычна з любым можа знайсці агульную мову, не любіць толькі скандальных людзей.

Раўшэн займаецца самба – гэта від адзінаборстваў, дзе можна амаль усё. У такіх відах спорту трэба ўвесь час змяняцца: калі на дзеянні суперніка адказваць заўсёды па адной схеме, становішся прадказальным. Хлопец пацвярджае: «Я пастаянна разнастайваю свой стыль. У пэўным сэнсе гэта можна перанесці на жыццё: аднастайнасць не толькі абмяжоўвае, але і ўганяе ў нуду. Усе змены павінны быць накіраваны на доўгатэрміновую перспектыву. Я лічу сваё жыццё цікавым, заўсёды імкнуся спрабаваць новае, шукаю сябе. Неяк вучыўся іграць на гітары, хачу як-небудзь пайсці на вакал, а яшчэ скокнуць з парашутам. Мару адкрыць сваю кавярню».

Спорт развівае дысцыпліну, лічыць Раўшэн: калі ты здольны падняць сябе ў шэсць раніцы і пайсці на трэніроўку, многае змяняецца. Дзень становіцца даўжэйшы, насычаны. Хлопец паспрабаваў шмат якія віды спорту, ва ўніверсітэце некалькі гадоў займаўся ў секцыі па армрэстлінгу і займаў прызавыя месцы на спаборніцтвах.

## Галоўная перашкода для студэнтаў– лянота

«Я не адзін дзясятачнік на факультэце, вучыцца на выдатна рэальна. Я звярнуў увагу, што на мехмаце выкладчыкі не „завальваюць“, а вось у БНТУ, дзе вучыцца родны брат, такое бывае. Важна развіваць сілу мыслення, аналітычны розум. На працягу дня я спецыяльна змяняю разумовую актыўнасць на фізічную. Пытанне ў жаданні, і пасля другога курса вучыцца на дзесяць стала маім прынцыпам», – заяўляе Раўшэн.

На думку Раўшэна, галоўная прычына няўдачы студэнтаў у вучобе – банальная лянота, бо вучыцца трэба адразу, з першага курса. Калі вырашыш узяцца за розум на другім ці трэцім курсе, прыйдзецца асвойваць праграму папярэдніх гадоў, бо навучанне ідзе паслядоўна, па нарастанні складанасці. Усё адно прыйдзецца пачынаць з нуля, а чым пазней, тым больш непад'ёмнай становіцца гэта задача. Прапусціў матэматычны аналіз, а захацеў вырашаць дыферэнцыяльныя ўраўненні – так не атрымаецца.

Першыя два гады навучання вельмі важныя, і, калі на апошніх курсах маладыя людзі ідуць працаваць і менш часу могуць надаць вучобе, катастрофы не адбываецца. За тыдзень яны могуць добра падрыхтавацца да іспыту, паколькі ў іх ёсць моцная база, нарыхтаваная за першыя курсы.

Раўшэн распавёў, як яму ўдаецца запомніць вялікія аб'ёмы інфармацыі і быць паспяховым у вучобе: «Зразумець – значыць уявіць сабе дэталёва вобраз таго, што вучыш. Вывучыць – ведаць паслядоўнасць слоў у тэксце, але без выразнага разумення. Матэматыка пабудавана на разуменні, візуалізацыі. Яшчэ на першым семестры нас навучылі ўяўляць матэматычныя даныя візуальна ў выглядзе графікаў, і такая карцінка знаходзіцца ў мяне ў галаве. І, калі я пабудаваў яе, значыць, разумею і магу аднавіць».

Юнак дапамагае рабіць лабараторныя іншым студэнтам, але заўсёды імкнецца растлумачыць, каб праца не прайшла марна. Можа быць такое, што выкладчык не прымае лабараторную, хоць яна і правільная, таму што студэнт не ў стане абараніць сваю працу, даказаць рашэнне.

– На мехмаце вельмі шмат вузкіх спецыялістаў, якія нават па адным выглядзе формул могуць сказаць, што дзе значыць і што рабіць далей. Таму настаўнік важны: мы можам рабіць, але не заўсёды разумеем, што. Нядаўна я вырашаў задачы і вывеў з мноства формул адну, але не мог зразумець, ці дакладна гэта, а калі падышоў да выкладчыка, то пачуў шмат добрых слоў – яна апынулася правільнай і цікавай.

Вядома, бывае складана, і гэта агульначалавечая рыса – стаяць на сваім. Складана бывае даказаць свой пункт гледжання, але мае поспехі ў вучобе, гэтая рэпутацыя дапамагае выкладчыкам паглядзець і на мяне як на эксперта, ёсць крэдыт даверу. У мяне раней таксама была такая рыса – доўга і зацята спрачацца, але я ад яе пазбавіўся і карыстаюся пры патрэбе, пустаслоўіць – проста марнаванне часу.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

## Візітоўка

- Галоўны сакрэт поспехаў Раўшэна ў навучанні – візуалізацыя. Ён уяўляе матэматычныя формулы як графікі ў прасторы.
- Для душы ён навучыўся іграць на гітары, але можа правесці некалькі дзён у адзіноце.
- Юнак з дзяцінства займаўся рознымі відамі спорту, а найбольш універсальным адзінаборствам лічыць самба.



Самыя яркія актывісты студэнцкіх арганізацый з 12 краін сустрэліся 28–31 кастрычніка на IV Міжнародным моладзевым форуме «М.І.Р.: Моладзь. Інтэграцыя. Развіццё». Іх аб'яднала тэма «Універсітэт пакалення Z: эвалюцыя вышэйшай адукацыі»

# Эвалюцыя вышэйшай адукацыі вачыма моладзі

**Сёлета наш універсітэт наведалі каля 70 студэнтаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Латвіі, Малдовы, Сербіі, Славеніі, Аўстрыі, Туркменістана, Польшчы і Албаніі.**

У першы дзень форуму ўдзельнікі былі падзелены на каманды, дзе яны сумесна са сваімі куратарамі рыхтавалі праекты па стварэнні структуры ўніверсітэта будучыні. Студэнты прапрацавалі пытанні, звязаныя з навучаннем, студэнцкім самакіраваннем, арганізацыйна-кіраўнічым працэсам, узаемадзеяннем універсітэтаў і ўдасканаленнем інфраструктуры. Галоўнай задачай было прэзентаваць сваё бачанне ўніверсітэта пакалення Z.

На працягу ўсяго форуму ўдзельнікі наведалі чатыры тэматычныя воркшопы, дзе атрымлівалі важныя веды, неабходныя для абароны праекта сваёй каманды.

Быў праведзены семінар «Дыгіталізацыя адукацыі пакалення Z у БДУ», дзе разглядаліся новыя тэхналогіі і спосабы іх інтэгравання ў навучанне студэнтаў БДУ. Для гэтага была запрошана **Алена Дастанка**, начальнік Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці БДУ.

Спікерам на другім воркшопе выступіла член пула трэнераў Савета Еўропы **Ксенія Фёдарава,** якая распавяла пра Савет Еўропы, пра яго структуры, якія займаюцца пытаннямі моладзевай палітыкі і працы з моладдзю. Хлопцы і дзяўчаты актыўна ўдзельнічалі ў выкананні падрыхтаваных заданняў.

Таксама ўдзельнікі форуму наведалі воркшоп «Лічбавы паварот і аналагавае мысленне: жыццё ў інтэрнэце ў студэнтаў пакалення Z» ад дацэнта кандыдата псіхалагічных навук **Маргарыты Фабрыкант.** Моцная зацікаўленасць у дадзенай тэме пацягнула за сабой гарачыя дыскусіі паміж удзельнікамі.

На воркшопе «Як сучасны бізнес падладжваецца пад асяроддзе і запатрабаванні пакалення Z» **Ігар Худніцкі,** заснавальнік digital-агенцтва 5S, распавёў пра тое, як студэнты пакалення Z выяўляюць сябе ў бізнесе і які штуршок да развіцця дыджыталу гэта дае.

На форуме студэнты як БДУ, так і замежных універсітэтаў дэманстравалі ўменне працаваць у камандзе, з кожным днём усё больш палемізуючы з нагоды розных аспектаў жыцця сваіх універсітэтаў і нават сваіх краін.

Так, **Джозэф Баркер,** студэнт Венскага ўніверсітэта, падкрэсліў, што Беларусь – вельмі прыязная краіна, у якой навучанне праводзіцца па цікавай сістэме. Форум дапамог маладому чалавеку разгледзець аспекты цяперашняй адукацыі з розных бакоў, падзяліцца сваімі думкамі з іншымі ўдзельнікамі, а таксама пазнаёміцца з культурай Беларусі.

Старшыня Студэнцкай асамблеі БДУ і кіраўнік аргкамітэта **Артур Кандраценка** з вялікім гонарам распавёў пра мерапрыемства: «Наш форум – гэта ўніверсальная пляцоўка для рэалізацыі сумесных міжнародных студэнцкіх праектаў. У тым ліку гэта ўнікальная магчымасць пагутарыць са сваімі калегамі і падзяліцца думкамі пра будучыню студэнцтва. Дадзены праект накіраваны на кансалідацыю студэнцкага руху і прадугледжвае пашырэнне міжнародных сувязяў».

Ініцыятыву правядзення форуму падтрымлівае не толькі кіраўніцтва БДУ, але і выкладчыкі розных факультэтаў. Працоўнай мовай форуму стала англійская, таму ў студэнтаў была магчымасць моўнай практыкі з носьбітамі.

Была складзена дамова пра супрацоўніцтва паміж *Студэнцкай асамблеяй БДУ* і *студэнцкім самакіраваннем Малдаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта*, якую падпісалі **Артур Кандраценка** і **Анастасія Вуткароў.**

Плануецца аказанне ўзаемнай падтрымкі міжуніверсітэцкіх праектаў у рамках СНД і на агульнаеўрапейскай прасторы, абмен досведам паміж студэнтамі, якія прадстаўляюць студэнцкія арганізацыі, правядзенне сумесных адукацыйных, навукова-практычных, спартыўных і культурных мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне прэстыжу студэнцкіх арганізацый і ўніверсітэтаў у цэлым.

Лідар студэнцкага самакіравання Малдаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта **Анастасія Вуткароў** выказала спадзяванне, што дамова паміж нашымі студэнцкімі арганізацыямі створыць падмурак для сумеснага праекта, які будзе накіраваны на абмен досведам і фарміраванне кантактаў сярод студэнцтва Беларусі і Малдовы.

Арганізатарамі форуму выступілі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Інфармацыйны пункт Савета Еўропы ў Мінску.

**Ганна ПАРАМОНАВА,**
**Юлія ЛЕШЧАНКА**





*Пагадненне паміж Студэнцкай асамблеяй БДУ і студэнцкім самакіраваннем Малдаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта*



*Ксенія Фёдарава з прэзентацыяй пра Савет Еўропы*



*Абарона праекта «Універсітэт пакалення Z»*



*Адкрыццё Міжнароднага моладзевага форуму «М.І.Р.»*

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

25 лістапада 2019 года
Падпісана да друку 21.11.2019 г.
Зак. 681. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***